Цана асобнага № 40 кап.

Вольная Беларусь

Тыднявік палітычны і літэратурны.

Умовы падпіскі:
На год...... 12р. —
На поугода.... 7р. —
На 1 мес.... 1р. 50к.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: г. Мінск Захараўская, 18. Тэл. 776.

Перамена адрэсу 50 к.

Год выдання II.

Ніхай жыве Вольная Беларусь!

№ 5. 1918 г. 17-го (4) лютаго 1918 г. № 5.

Гісторія Беларусі.

Посьля часоу Усеслававых, Беларусь (полацкага перыоду) траціць сваю палітычную магутнасьць. Энэргія народу, яго грамадзянская і ваяунічкая заузятасьць наслабляюцца, і кіяускія князі разоу кольні страшэнна пустошаць беларускія земі. Уладзімер Манамах зруйнавау месты: Воршу, Копысь, Мінск і Друцк да шчэнту. Вялікі паход кіяускіх князёу у 1127 і потым паход Мсціслава Кіяускага у 112[illegible] годзі на Белую Русь зьнішчылі агнем і мячом месты (гарады): Лагойск, Ізяслау (Заслау) і Полацк. Тагды-ж былі завоеваны Полацкае і Мінскае княствы і у самым Полацку сеу княжыць Мсціслау, сын Сьвятаполка.

Мсціслау, пасадзіушы на княжаньне у Полацку свайго сына, пайшоу на Літву, бо яна блізка тарклася да беларускіх спрау наогул і часта была прытулкам полацкім князьям, калі ім даводзілася уцякаць ад кіяускіх князеу. Літва спрадвеку мела многа супольнага з Белаю Русею. Некаторыя плямены літоускія залежылі ад беларускіх, а іншыя беларускія плямены жылі на землях, што належалі да Літвы, напрыклад у цяперашняй Віленшчыне, або, у так званай, Вышняй Літве.

Хібнасьць хроналёгічных даных пра некаторыя перыоды гістарычнага жыцця старадаунейшай Беларусі, няустаноуленасьць і хібнасьць або страта граніцау паміж княствамі у беларускіх землях,—усе гэта разам давало магчымасьць некаторым гісторыкам, каторых мала абходзіла доля Беларусі, выказываць, што Белая Русь ні мае сваей дзяржаунае гісторыі.

Для агляду Беларусі, як асобнага дзяржаунага арганізму, трэба зьвярнуць увагу на [illegible] што Белая Русь мала свайі [illegible].

Беларусь здауна славілася вялікім лікам гарадоу і мястэчак, асабліва у часы Варажскага [illegible]. «На некаторым прыкметам,—кажа Іловайскі,—полацкія князе уладалі нізкам рэчкі Дзьвіны амаль ні да самаго Балтыцкаго мора (балтосемы) і зьбіралі падаткі с тутэйшых жыхароу. Але яны ні парупіліся аб тым, каб умацаваць за сабою ніз гэтае рэчкі і ні збудавалі там моцных рускіх гарадоу». Потым трэба зьвярнуць увагу на хатні (унутраны) лад і гістарычныя (народныя) традыцыі.

Сьлед тут зазначыць, што на Беларусі, як і на Украіні, вечавы грамадзка-дзяржауны парадак быу натта пашыраны, а так сама былі развіняны і мелі вялікую вагу родавыя і дзяржаупыя традыцыі. Беларускі народ праз сваю палітычна-грамадзянскую арганізацыю—вечо, рупна сьцярог і заховывау спаконвечныя правэ, пільнавау за тым, каб спадкаемство князеу адбывалося па родавому праву і каб князь залежыу ад волі веча, каторае наўят самаму законнаму насьледніку княства давало цалаваць крыж на вернасьць інтарэсам народным.

Які меу уплыу на дзяржаунае жыцьце гэты вечавы парадак, цяпер па асобным адрыучатым фактам трудна судзіць. Адно пэуна, што спрычыненне народу да дзяржаунай палітыкі заходзіло вельмі далека. Гэта зазначыу нават Іловайскі, хоць, праудa, зазначаючы гэта, мяркавауся ен саусім ні народнымі інтарэсамі. Ен кажа, што полацкае княство было ні моцнае праз тое, што народ адносуся да сваіх князеу «безпокойно и строптиво».

Наогул, на Беларусі часта траплялося, што насяленне скідало князеу, або, напрыклад, у 1185 годзі, падчас агульнаго паходу на полаучау, смаленскае войско у Трэпалі склікало веча проціу свайго князя і адмовілася ісьці далей. Такія выпадкі траплялися ні адзін раз.

Або вось яшчэ прыклад арыгінальнаго адносіньня народу да князя. Полацкі князь Усеслау Васількович (княжавау 1160—1180 г.) быу дужа каханы народам. Яго шанавалі усе, нават удзельныя князі, за розум і справядлівасьць, і усе називалі яго «Вялікім». Дзякуючы гэтай агульнай пашане да свайго князя, веча, пасля яго сьмерці, ні хацело выбіраць сабе новаго князя і *завяло у Полацку рэспубліку.* Выбрано было 30 чалавек старшын. І *гэтая рэспубліка існавала у Полацкім княстве аж 9 год, ад 1181 да 1190 г.* Магчыма, што праз частае скідыванне і зібранне князеу, княжыцкая лінія (гэтак кажа Іловайскі) вельмі заплуталася, і выбар 30 старшын стауся таму, што ні было на той час асобы княжыцкаго роду, каторая-б карысталася агульнай пашанаю і даверам. Абраць жа за вялікаго князя чалавека ні з глаунае княжыцкае лініі,—на гэта ні мелося у полачан звычая. І праудападобна, у 1190 годзі, быу абраны за полацкаго князя нехта *Мінгайла,* а потым быу яго сын *Гінвіл,* каторы княжыу да 1199 году. Хоць праз падама, хто былі Мінгайла і Гінвіл, але, біручы на увагу традыцыйныя звычкі і псыхольогію полачан у справі выбароу князеу з роду глаунай княжыцкай лініі, можна сказаць, што *гэтыя два князе былі старадаунейшаго роду полацкіх князеу,* хоць і насілі літоускія імены. (Гэта тым больш для нас важна, што як раз каля гэтаго часу, цэнтр дзяржаунаго жыцця беларусау пераносіцца с Полацку у Літву, дзе і пачынае закладацца магутнае і слаунае Беларускае гасударство, каторае ведомо у гісторыі пад назваю *Літоуска-Рускаго княства*).

Посьля Гінвіла княжыу Барыс, сын Романа Усеслававіча, але астатнім князем з роду Ізяславічау уважаюць *Брачыслава.* У гэты самы перыод гісторыі Беларусі распачыняюцца буйныя змаганні беларусау с крыжакамі (1223 г.), (каторыя і былі глаунаю прычынаю таго, што дзяржауны цэнтр Беларусі перанесся на Літву, дзе к гэтаму часу усьпеу утварыцца моцны дзяржауны арганізм з беларускаго і літоускаго народу с князямі полацкаго роду на чале).

Пад канец VII сталецця глауная лінія полацкіх князеу саусім вымірае, і гатуюцца у політычным паветры вялікія пераваpоты для Беларусі.

Літва расьце і дужэе у той час, як Беларуская зямля слабее ад пастаянных сварак і частых баеу с кіяускімі князямі, каторыя наводзілі на беларускія землі злучанае войско усіх уходніх і паудняво-уходніх княствау. Ужо у XII сталецце, у той частцы Беларусі, дзе насяленне было перамешане з літоуцамі, налажылося княство Літоуска-Заблінскае с сталіцаю Навагрудкам (цяпер паветовы горад на Міншчыні).

У 1230 годзі Літоускі князь *Рынгольд* напау на Беларускія землі і завоевау. Беларускія князі выступілі проціу яго, але былі разьбіты да шчэнту. Бой адбыуся пад рэчкаю Неманам пад сялом Магільным.

У 1236 годзі Рынгольду пашанцавало разьбіць і крыжацкае войско. Гэтыя дальнейшыя перамогі ды яшчэ тое, што с поудзеннаго стану насунулі татары, далі магчымасьць Рынгольду быць некульшто спакойным.

С 1242 году пачынаецца княжаньне *Міндоуга,* сына Рынгольдаваго. У яго часы Літва узмацняецца, закладаецца на паунночным заходзі Беларусі ордэн (союз-ка) крыжакоу, каторы адпаве пагражау Літве і Беларусі. Татары пашыраюць сваю уладу аж да Белай Русі, але зусім беларускае культурна-політычнае жыцце спатрэчаецца с каталіцкім сьветам і ту[illegible] распачынаюцца новыя сталетныя войны, падчас каторых выступае новы [illegible]

ны да гэтаго часу, вораг „Русі Літоускія" —*Масковія*...

Такім чынам, выяуляецца, што Белая Русь (полацкаго перыоду), жыла слаўным гістарычным жыццем у перыод з VIII-го сталецця, а можа і раней таго, аж да XI сталецця. Потым 3—4 сталецці змагалася з сваімі суседзямі за сваю незалежнасьць: с кіяускаю Русьсю—Украінаю, з Літвою і Польшчаю, каторая «памагала» Беларусі, з Лівоніей, з ордэнамі крыжакоў і мечаносцаў, а так само і с татарамі. Нарэсьці, па пачыну Івана III, каторы па звычаю маскоускаму хапеу Белую Русь—Літоускую—«к рукам прибрать», распачалася вайна з Масквою, каторая цягнулася с перарывамі каля паутараста год.

П. Нечыпорэнко.

Народ і інтэлігэнцыя.

За апошнія сто гадоў народ быў для інтэлігэнцыі першым пунктам апоры. Лепшыя сыны з народу, як у сьвятую Мекку, «ішлі у народ.»

Яны напаўнялі астрогі, гінулі на шыбеньніцах, гнілі у казаматах, закутыя у ланцугох, паміралі у адзіноці у халоднай Сыбіры на катарзе і рэдка-рэдка каму пашанцавала уцячы за межы роднай зямелькі, ратуючыся ад прагавітых царскіх тыранаў.

Сваімі сьвятымі мучальнікамі ад інтэлігэнцыі народ мог бы напоўніць увесь календар на цэлы год па некалькі дзесяткаў на дзень...

Народ быў Сынаем для гэтых ваякаў за Волю. Народ быў іх богам. Словы яго былі для іх Эвангэллем. Народ быў атуляны у іх марах-думках біблійна-паэтычным арэолам. У кожным з гарапашнікаў-хлебаробаў інтэлігэнцыя бачыла Хрыста, Хрыста пакутніка, каторы навекі прыцьвякованы да крыжа мук і зьдзеку.

Народ вабіў інтэлігэнцыю двума сіламі:

Першая сіла—страшны зьдзек прыгону, паніжэнне чалавечаго «Я.» Спадчына паншчыны да апошняго часу.

Другая сіла—жыцце ратая сярод прыроды у прастаце, у наіўна-дзявічнай шчырасьці.

Ад гарадзкіх шэрых сьцен, ад закураго дымам гарадзкога сонца, ад мішурнаго блеску гарадзкой распусннасьці,—інтэлігэнцыя рвалася у поле, у лес, у вёску, богатворучы сермяжніка-пакутніка.

І вось народ, дзякуючы віхору вялікай вайны, а, галоўным чынам, дзякуючы інтэлігэнцыі, стаў на ногі. Сімвалічны мучальнік, асьпеваны, усдаўлены у гімнах сваіх прарокаў-інтэлігэнтаў, пачаў выпростываць свае акрываўленыя, згорбленыя плечы...

Народ адкрыў вочы с цемры на сьвет і пачаў азірацца па бакох.

Пачаў народ азірацца нідаверчыва, апасьліва і гэта было зусім справядліва. Бо, пазнаўшы сваю цемнату, сваю нясьвядомленасьць, народ баяўся зноў падпасьці пад ярмо выпадковых спрытных нісумленных людзей—палітычных авантурыстаў.

Народ асьцерагаўся інстынктыўна.

Але ні па сілі было асьцерагацца да канца. Інтэлігэнцыя,—спаткаўшыся тварам да твару з народам, у якім гнеў за усё мінулае кіпеў у душы, каторы вымагаў, каб усе даўгі яго за некалькі вякоў былі выплачаны адразу,—ні магла пайсьці сьлепа за народнымі лозунгамі, ведаючы німажлівасьць выпаўнення практычна у жыцці за кароткі час такіх дамаганняў.

Гэта узбудзіла падазронасьць народа да інтэлігэнцыі, гэтым скарысталі хітрыя людзі, ніволынікі натоўпу, сучасныя Пугачовы, каторыя узялі народ пад сваю апеку. Яны завабілі народ прыгожымі падатлівымі для яго славамі, карыстаючы яго цёмнымі інстынктамі і народ за імі пайшоў. Іначай рабіць ён ні мог.

Пад выкрыкамі і гіканнем сучасных Пугачовых народ ахмялеў. І брат на брата пайшоў, і сын на бацьку. І народ у асьляпленасьці сваёй пачаў губіць сам здабытую за вялікія ахвяры, за цэлыя рэчкі чалавечай крыві, доўгажданую Волю.

Дзікім віхорам пусьціліся па нашай зямельцы азьвяралыя людзі. Яны гарцуюць цэлымі бандамі і нішчуць, і грабюць, і забіваюць. Апошняе зерне на гарэлку выганяюць і творуць голад, руіны нібывалыя у нашым краю.

Чорныя рыцары, у социялістычных забралах дзеля блізіру, ускалыхнулі у народзе зьвярыную помсту за мінулае, і народ цяпер сам сябе устрымаць ні можа. І доўбнямі брат брату убівае «праўдзівы социялізм» у галаву. Так глыбока заганяе, што аж чэрап трэщчыць...

А усё-ж такі сам народ ні вінават, а вінаваты тыя новыя вучыцялі, якія моцна захапілі яго у свае рукі.

Гэтыя вучыцялі разьдзялілі яго на дзьве часьці—на «таварышаў» і «буржуяў.»

Паглядзелі на чалавека—вопратка і белы каўнер—і асудзілі яго адным важкім словам: «буржуй.» Пасьля гэтаго чалавеку ні то што ні вераць, а паніжаюць і крыўдзяць розными способамі.

Атрымаў чалавек такую-сякую адукацыю—«інтэлігэнт», «буржуй», і беда гэтым людзям. Дайшло да таго, што у вёсцы бацька ні даверае роднаму сыну вучыцелю «інтэлігэнту.» Бо сын ужо бытцам «за папоў трымае...»

А вось розным падазронным «таварышам с фронту», мо бышым уголоўным праступнікам, ні курадзікам—вераць. Бо тыя хітра маскіруюцца пад «прыяцелёў народу», кажучы цёмным людзям:

«Рэж, бяры, грабуй!—і, за добрую навуку, частку здабычы у буржуяў нам дасі!..»

Гэтым цёмны чалавек ні можа ні верыць...

І робіцца нешта кошмарнае, страшное, дзікае. Людзі парабіліся, як зьвяры.

Выйшло так, што бытцым сам народ дайшоў да праўдзіваго социялізму, а яго сыны—інтэлігэнты зрабіліся «буржуямі.» Народ адгарадзіў сябе каменнай сьцяной ад тых сьвецлых людзей сваіх, якія дзесяткамі гадоў жылі толькі для народу. Але гэта каменная сьцена ні на доўга. Народ пазнае праўду і разрушыць гэту сьцяну.

А інтэлігэнцыя, ні гледзючы на гэту сьцяну, ні адышла ад народа. І цяпер праўдзівыя піанэры Народнай Волі пакутуюць толькі за народ і яшчэ бліжэй да яго падыйшлі, бо без усялякай ідэалізацыі, а натуральнымі вачыма глянулі на народ...

Інтэлігэнты яшчэ больш, як раней, пакутуюць за народ, бачучы, як народ сам сябе губіць пад уплывам лжэ-прарокаў. Народ агледзіцца у хуткім часе і злучна са сваімі шчырымі сынамі,—інтэлігэнцыяй,—пойдзе да сапраўднай лепшай долі.

Народ ні дапусьціць замарыць сябе да канца, каб пасьля гэтай навальніцы ні прышлося дзесяткі гадоў працаваць толькі на тое, каб як-колвек стаць на ногі.

Інтэлігэнцыя і народ зразумеюць адзін аднаго і сальюцца у адно сэрцо, у адну душу і ніякаго разьдзелу паміж імі ні будзе.

З. Бядуля.

Кароткі фэльетон.

Старавіна у навіні.

— Чыталі?—запытаўся у мяне, як аб нечым вядомым, Мікалай Уласавіч, схапіўшы мяне за рукаво сярод вуліцы, поўнай грукату хурманак, гулу аутомобільных гудкоў і людзкаго гоману.

— Што—чытаў?—адказаў я на запытанне запытаннем, паволі адыходзючыся наўзбоч, каб ні трапіць пад калёсы аутомобіля.

— А што Усерасейскі Устаноучы Сойм...

— Разагналі?—перабіў я, думаючы, што гутарка аб гэтым,—дык усе-ж гэтаго спадзявазіся. Бо...

— А не!—ні даў дагаварыць мне Мікалай Уласавіч і падсунуў мне пад самы нос скамечаную у кішэні газэціну, у якой было надруковано:

«Именемъ народовъ, государство Российское составляющихъ, Всероссійское Учредительное Собраніе постановляетъ:

Государство Россійское превозглашается Россійской демократичной федеративной Республикой, объединяющей въ неразрывномъ союзъ народы и области, въ установленныхъ федеральной конституціей предѣлахъ суверенные»...

— Прачыталі? А цяпер аб зьезьдзі «Совдэпаў» прачытайце... во-во... гэтае месьцячко.—І Мікалай Уласавіч, паказваючы пальцам тое, на што яму хацелося зьвярнуць маю увагу у газэці, сам прачытаў за мяне: «По постановленію III-го Съѣзда совѣтовъ р. и с. депутатовъ Россія объявляется Россійской социалистической федеративной республикой»...

— Прачыталі?—зноў запытаўся Мікалай Уласавіч, сам скончыўшы чытанне.—Ага, на вашую думку—што гэта азначае?—

— Што-ж азначае? На мой погляд —гэта два законы. Адзін скасованы, як скасавана і тая установа, што яго выдала, а другі—покуль што не, але абодвы падцьвярджаюць адно і тое: што Расія павінна мець фэдэратыўны лад... Так—як-бы нехта на актовым лісьці пана Львова паложыў двухгаловую печатку Керэнскаго, а зьверху — паставіў-бы штэмпель т-ша Леніна...

— Ат, ні бачыли, васпан, з-за кустоў лесу! Прачытаў, ды нічога ні вычытаў...

— А што-ж вы іншае тут бачыце, Мікалай Уласавіч?

— Ведаеце што?

— А што?

— Панаванне монархізму у Расіі,— вось што!—Старавіна, як шыльцо з мяшка вытыркае,—а вы і ні дабачылі?— засьмеяўся ён сіпата і весяла.

— Якая цяпер можа быць гутарка аб монархізму, Мікалай Уласавіч?—зьдзівована запытаўся я:—калі рэвалюцыя, пане мой, да соцыялізму дадыбала. Не, не,—гэта нешта ніпадобнае!

— А вы ж чыталі толькі што: «устанавливается» фэдэрацыя, у якую сілком упягваюцца «народы, въ предѣлахъ федеральной конституціи суверенные»? Чыталі: «устанавливается социалистическая совѣтская федерація». Хіба гэта па вашаму—ні монархізм? «Скарэй, скарэй у навуку к нам! На чом хлеб-соль пакажам вам». Ха-ха-ха! —засьмеяўся зноў Мікалай Уласавіч.— Хіба ж гэта ні монархізм?—запытаўся ён, тузануўшы мяне за рукаў.

— Якім спосабам?

— А такім, як яно робіцца... Вазьміце Мікалая маніфэсты... Усё тое самае, толькі модэрну у словах крошку падпушчана...

— Ну, ведаеце!.. Гэта усе-ж такі ні Мікалай II пісаў, а дэмакраты, прэдстаўнікі народаў, соцыялісты...

— Якіх народаў? Хіба ад народаў там гэтыя правыя і левыя эсэры, вялікія і малыя эсдэкі? Хіба яны ад тых народаў, што кожны мае сваю мову, культуру і бацькаўшчыну? Народы зрабілі-б іначай. Спачатку кожны сам с сабою паразумеўся-б, а ужо потым, калі-б вымагалі таго іх дзяржаўныя інтарэсы, злучыліся-б у фэдэрацыю. І зышліся-б на агульны фэдэральны сход ні быля як, а па праўдзіваму дэмакратычнаму прэдстаўніцтву, у роўным ліку, а ні колькі ад каго папало. Народы і пастанову зрабілі-б іншую, а ні такую...

— Даліся вам гэтыя пастановы, Мікалай Уласавіч! Я ані як ні уцямлю, што вы да іх маеце—аб якім монархізму яны сьведчаць?..

Сымон Музыка.

(Казка жыцця).

Часьць трэцця.

У кухні жыдавой, ля печы,
Адвялі Сымону кут.
Брудна, цесна, ды галечы
Можна жыць было і тут.
Папалам з ліхой бядою.
«Ну, што-ж?» думае Сымон:
«Я адзін, адзін душою!
Дзе ні кідае прыгон?
Як нядоля ні ушчувае!
Як бяда падчас ні гне!
А другі й таго ні мае,
Што знайшлося у мяне.»
У гэтай кухні меў пасаду
Шлёмаў парабак, Яхім.
Ён узяў хлопца пад абладу
І памог яму сім—тым.
Разам ложку зчайстравалі,
Каб меў хлопец дзе спачыць.
Пару бабахаў дасталі
Цело маявае акрыць.
— Ось цяпер ты князь, ды годзі!
Пазайздросьціць сам прусак,
Што у пчыліпі—гаспадзі
Век зывае, нібарак.—
Жартаваў Яхім з музыкі,
Як абладвалі пасьцель:
— І сам Шлёма, пан вялікі,
А яшчэ больша круцель,
Так ні будзе з сваей Хавай
Нават ў «кучкі» спачываць—
Сьмешнай мовай і цікавай
Стаў Сымона забаўляць.
І асьмейваў усё на сьвеці,
Шлёму с Хавай больш за ўсіх.
І капаўся, як у сьмецці,
У справах, звычаях у іх.
Потым ў хлопца запытаўся:
— А ты ж, хлопчэ, колькі шкур
Шлёмі даць ахвяраваўся,
І за колькі прадаў дур?
Раскажаў Сымон умовы,
На якіх застаўся жыць.
— Го, жыдоўскія галовы!
Штукарэ яны круціць!—
Джургануў Яхім чупрыну.
Люльку злосна стаў ён ссаць
І пасунуўся у адрыну—
Трэба воз было прыбраць.
«От дык штука! гэ! цікава!»
Стаў Сымонка тут гадаць:
«Ні то праўда, ні забава,
Каб дурнога ашукаць?
Дык хіба ж я тут прывязан?
Ці ні пан сабе я сам?
Ці мне Божы сьвет заказан?
Ні стрываю—маху дам!
А як будзе тое—ні знаю,—
Хіба ж я жыву ў раю?
Дык я тут надзею маю—
Можа Ганначку спаткаю,
Зорку ясную маю.—
Надхапілі зноў Сымонку
Думкі-мары, мысьлі-сны
І ў чароўную пялёнку
Спавілі жыцце яны.
Усе Сымонка забывае,
Вочкі ў глыб душы глядзяць.
І шчасьлівы сьмех блукае,
Губы хочуць што-сь сказаць.
І нічога ён ні чуе,
А яго ўжо разоў два
Кліча Хава і сардуе:
— Уй, дурная галава!
Як глупяц затакаваўся,—
Прынясі, ідзі, мне дроў!—
Хлопчык, спуджаны, капаўся—
Сьвет чароўны разьбіваўся.
Ніхнуў ў злосьці гэтых слоў.
І Сымонка бег без спрэчкі
На дрывотню за стадол,
Па ваду хадзіў на рэчку,
Працаваў, як чорны вол.
А Яхім у вус сьмяяўся
Ды плячыма паціскаў,
За Сымона заступаўся,
Шлёму «пархам» называў.
У карчомцы быў асобны,
Свой уласны жыцця склад,
Свой рахунак, брудна-дробны,
Звычай, права і урад.
Хлопчык жыў і прыглядаўся,
І тады, як ён прызваў
Перад Шлёмам і баяўся,
Жыда «панам» называў,
То Яхім ні раз у вочы
Сыпаў Шлёмі, як пяском,
І з ім Шлёма ніахвочы
Быў стыкацца языком.
Карчма радка пуставала,
Чуць разьвідніцца—сюды
Чья-нібудзь душа віталя,
Шоў стары і малады
І наскора выпівалі,
Зьеўшы с хлебом сялядзец;
Прыбывалі, выбывалі
І гаратай, і касец,
Цэлы дзень рыпелі дзьверы.
І былі такія тут,
Што ніяк ні зналі меры
І, сагнуўшыся, як склют,
Цярпліва выжыдалі.
Дзе-б к кампаніі прыстаць,
Або стала разважалі,
Што-б ў залог тут Шлемі даць.
Так бывала у дзень будны,
У сьвято—нельга і прайсьці,
Брата, бацьку было трудна
Тут разгледзіць і знайсьці.
Але летам то нічога,
От зімой зайсьці ў карчму!
Тут падзівішся нябога,
Згубіш сумную думу.
Тут падчас трасуцца сьцены,
Лавы крышацца, дрыжаць;
Часта ў ход ідуць палены,
Пэйсы Шлёмавы трашчаць.
Сёмка тут напне казанні,
Як Маньота лез на плот,
Як Чылін сьпеваў літаніі,
Як жаніўся Лысы Дод.
Пра шаўца пачнэ ён казкі,
Як раскажа—хоць ты ляж:
Як у Хасі, з яго ласкі,
Нарадзіўся Мэсьяш,
Два Антосі—Дзяўц. Лата
Напешаюць тут усіх,
А Базыль, Карусь—дваБраты
Зводзяць двух братоў чужых,
І ні раз тут заказталісь,

— Цікавасьць, што вы ні няміце! Ну, паслухайце: стараліся маскоўскія цары, каб усе народы сіламоц трымаць у адной жмені?

— Стараліся.

— Падводзілі яны усе падўладныя ім народы пад адзін маскоўскі капыл?

— Падводзілі.

— А вашыя гэтыя усерасійскія Соймы і «Совѣтскіе» зьезды—што яны робяць?

— Як—што?

— А так... «Установляють» яны, каб усе народы Расіі былі у адном фэдэратыўным зьвязку?

— Ну, устанаўляюць...

— Абмяжаюць яны іх суверэннасьць фэдэральнай конституцыей, якую самі-ж сабіраюцца напісаць?

— Ну, абмяжуюць, скарачаюць...

— Ага,—вось гэтак, ведаеце, і фон-Гофман «устанаўляе» і нават сваю «фэдэральную» конституцыю для нас мае, калі кроіць нас ад Дзьвінску праз Мінск да Брэсьця. Але ж ён, прынамсі, таіцца ні будзе, што спрыяе монархізму, а тут; бачыце, як спрытна. Хітруны, далі пан!..

— Не, Мікалай Уласавіч, ні магу я згадзіцца з вамі! Як гэта можна Гофмана, напрыклад, раўняць з Леніным ці Керэнскім? Гэта-ж соцыялісты...

— Ды я ні раўную. Дзе там! Ленін ужо выскачыў «с царства прымусу у царство свабоды» і загадаў усіх за сабою у рай дзўбнёй заганяць. Хіба-ж можна раўняць яго з Гофманам?! Крый мяне Божа! Я толькі хачу заўважыць наогул, што там, на Маскоўшчыні, кроніку «самабытнасьцю» алдзе. Там людзі ні разумеюць іншаго права, апрач падарованаго пераможнай налужаннаму: там ні ведаюць іншай конституцыі, апрач абвешчанай з высаты прэстолу—«онтрепрованной»... А Ленін,—о, Ленін! «Гром побѣды раздавайся! Веселися, храбрый россъ!» «Суверэнная» Украіна пад нагамі соцыялістаў, бо у соцыялістычным раю нічога з гэтаго сьвету ні трэба, а яна, дурная Каробачка, хацела хлеба у рай захваціць... І ведаеце што? Але... бывайце здаровы!

І ні развітаўшыся, Мікалай Уласавіч раптам навярнуўся у другі бок, і зьнік сярод вулічнаго натоўпу.

Валадзюк.

* * *

Тая-ж самая даль, той жа самы разлог,
Неагляднаы прастор небасоў,
Дзе усе хмаркі плывуць на дарозе, што Бог
Ім адзначыў с пачатку вякоў.
Усе гамоніць вакруг і шуміць, як даўней,
Гэты лес векавы, гэты бор...
А чаго-ж сумна нам? Як, злы сухавей
Закружыўся, узьняўся з-за гор?
Як у восень туман аблягае луга
І галеў задуменную даль,
Так на сэрцы зьлягла нейкі сум і туга,
А мінулых дзянечкоў так жаль!
Эх, ні вернеш ты іх, гэтых сьветлых дзянь-
(коў).
Толькі цені іх у сэрцы жывуць!
А як міл Божы сьвет і прасторы стэпоў
Дзе прыгожыя хмаркі плывуць...

Якуб Колас.

ДОПІСЫ.

(Ад нашых дапісчыкаў).

Мінск. С 14-го студня горад Мінск зноў апынуўся у стані аблогі. З 10-і гадзін у вечар жыцьцё у горадзі «павінно заміраць», як пісалося у прыказі пра аблогу. У гэты час вуліцы пусьцеюць і

Хто больш вышэ ні сажрэ,
Колькі раз «у плечкі» брались.
Хто, нарэшце, адбярэ.
Тут зубамі крэпкі Сыса
Ступу тоўстую насіў,
І Варьяту Янка Лысы
Пузо ботамі мясіў.
А той жылы ўсе напружыць,
Голы ўздуецца жывот,
Янку носіць ён і кружыць—
Пацешаецца народ.
Тут, бывала, ў карк Піліпа
Гнала жонка с карчмы вон,
І аб сына стары Клыпа
Чапялу ламаў і млён.
Тут ігрышчы адбываліся
Перад сьвятамі зімой.
І трасьліся, калыхаліся
Сьцены, дошкі пад нагой.
Дзяцюке пабраўшы пары,
Тут ляталі, як віхрэ.
Як пры лесі на папары
У гіз бегаюць валэ.
Верцяць дзевак, як круцёлак,
Па паветры іх нясуць,
Сьцены, прыпяк і някодак
Іх хвальбонамі мятуць.
Аж падлога пад нагамі
Гнецца, крэхча і рыпіць,
І агонь у тахт з рубцамі
У лямпі с подскакам гарыць.
Натамяцца, папацеюць,—
Дзьверы насьцеж—на мароз!
Покі лбэ пахаладзеюць,
І пачне сінецца нос.
Весяліліс маладыя,
Частаваліся, пілі.
Для іх вечары сьвятыя
Многа радасьці нясьлі.
А Сымонка, як праклятцы,
Ім да трэціх пеўнаў граў.
Толькі ён ні ведаў сьвята,
Сьветлай радасьці ні знаў.
Без ахвоты, без утхнення
Смык ускідвала рука,
Ні хапало і цярпення,
Сіл падчас у бедака
Граць праз цэлых тры гадзіны
Нескончоную кадрыль.
Марнаваўся век дзяціны,
Талянт брудзіўся у пыл,
І прышлося тут хлапчыне
Чарку горкую спазнаць,
І ён чуў, што сэрцам гіне,
І душа яго тут стыне,
Дару Божаго нячаць.
Сьветлы дзень —што ноч: так
само!
Жыцьце тут было адно,
І глыбей уцягала яма
Хлопца беднаго на дно.
Рано хлопчык падымаўся,
То каморкі падмятаў,
То пры кухні увіхаўся,
Шлёму, Хаві памагаў.
Так весь дзень і быў заняты,
А каб час ні марнаваў,
Ад Сымонка Шлёма клятцы
Смык і скрыпку адбіраў.
—Будзе струмант так пацёнты,
Без патрэбы што іграць?
Трэба, хлопча мой мілейшы,
Свае рэчы шанаваць».
Крыўда у сэрцо западала,
Ірваў грудзі хлопцу жаль,
Як струна, душа дрыжала,
Але сілы ні хватало
У зіму выбрацца у даль.
І хадзіў ён, ціхі, смутны,
Горо у сэрцы затаіў,
Як бы нейкі каламутны
Пераваі яго насіў.
—Ну,Сымон штось ні у гумору!
Заўважываў Яхім:
—Бачу, ты ні йдзеш у гору:
Шлёма—кепскі твой айчым.
Ты—падкухцік,ты—музыка,
Падметайла, вадавоз,
І маўчыш, як без языка,
І цягаеш Шлёмаў воз.
А усё горо у тым, відома,
Што ты мяккі, брат, як смоўж,
І табою верціць Шлёма
І упоперак, і удоўж.
А тут трэба агрызацца,
Кіпні у шкуру запусьціць.
Што табе жыдоў баяцца?
Ці без іх ні можаш жыць?
Толькі што-ж? твая натура
Так, ні людзкая, скажу...
Меней, хлопча, трэба дуру:
Цяжкі воз—гак на гужу!
«Дзякуй вам за хлеб, за кашу
І яшчэ за мілосьць вашу!
Вот хамут вам, вот дуга,
А я больш вам ні слуга».
Дзівачок ты!—з нейкай ласкай
Далае яшчэ Яхім:—
Цяжка жыць с чужой папаскі,
Лепш ідзі к бацьком сваім:
Сэрцо бацькаво—ні камень,
Бацькаў хлеб— смачней віна
І ні зломіць тваіх рамен
Праца бацькава гумна...
Ці ж бы я служыў у жыда,
Каб я меў бацькоў і дом?
Прападзі ён, гэты скнмда!
Ды пабі яго і гром!—
—Эх, Яхім!—уздыхнуў хлап-
чына:—
Мо і праўду кажаш ты;
Разъедная ж бацьку й сына
Бераг зрывісты, круты.
І нам з ім ўжо ні сайціся,
І да бацькавых харом
Сьцежкі усе мне запляліся,
Заваліў іх буралом,
Бо мы з бацькам—чужаніцы,
І нам поплеч з ім ні йсьці;
Есьць, Яхім, у душы граніцы—
Іх ні здолееш прайсьці...
—Ат! гаворыш ні да ладу,
І ні сьцяміш, што сказаў;
Як відаць, ты любіш здраду.—
Абы у карк цябе хто гнаў!—
Адказаў Яхім сярдзіта,
Павярнуўшыся на бок
І дадаў:—табе карыто
Лепш за бацькаўскі хлябок...
Змоўк Сымон—Яхім нічаму,
Што прычыніць хлопцу боль,
Што яго ён так ахаяў,
Як бы у вочы кінуў соль.
Хлопчык доўга быў ні у сілах
Заспакоіцца, заснуць,
І агонь кіпеў у жылах,
І ад плачу рвалась грудзь.

(Працяг будзе).

Якуб Колас

пачынаецца стралянiна. Страляюць па усiх канцох горада i, мабыць, з усiх «родовъ оружiя». Часам здаецца, што горад аблажылi ворагi i бяруць яго прыступам. А гэта салдацкая варта бухае у паветро, каб палохаць злачынцау, нi можа так сабе, дурэючы. Подчас страшна сядзець у памешканьню i робiцца нуськiшна i маркотна. Думкi шугуюць, як павуцьё, i нагоняюць сум i маркоту.

Тым часам, военная аблога мала памагае. Нiма таго дня i нi [illegible] тае ночы, каб дзе не забiлi каго ci не абрабiлi. Грабяць у самым цэнтры горада, на самых ленiвых вулiцах. Залазяць у кватэры i на вачах гаспадароу забiраюць усе хатняе дабро. Крадзеж i грабежство павялiчваюцца. Горад перапоўнены салдатамi с фронту, шмат сартау, башкiрау, кiтайцау, буратау i iншых iнародцау, што наварочалiся з военных работ. Хлеба у горадзi нiма. У шмат каторых сталоуках абеды падаюцца без хлеба. У прадэзы за хунт чорнаго хлеба плацяць 1 рб. 50 к., але трудна дастаць.

Горад выглядае брудна i нi прыбiраецца. Каб трапiлi сюды немцы, то сказалi-б, што тут жывуць нi культурныя людзi, а нейкiя бушмены нi тунгусы с паўночнай Сыбiры. На вулiцы валаюцца здохлыя конi i нiма каму вывезьцi. На самай людной вулiцы, у цэнтры гораду, здох конь ранiцай, праляжау цэлы дзень да так i пачынаць застаўся. Палую зiму баставалi дворнiкi, сьнег нi ачышчауся, на тратуарах ляжау гурбамi. Хадзiць было нямагчыма. Людзi валiлiся, калечылi сабе бакi i ногi, а устаўшы, лазiлiся, ды карабкалiся далей, апiраючыся аб сьцены i падаючы на рукi. Цiпер тратуары крыху абчышчаны, але пападаюцца, так сказаць, «нейтральныя месцы» пры перавулках, дзе i цiпер сабакi ногi паломяць. На гэтых «нейтральных зонах» людзi праходзяць, набраўшыся за рукi.

Гарадзкая Дума распушчана. Было забурэнне с каталiкамi с прычыны опiсу iнвэнтара у касьцелi катэдральным. Сабраўся натоуп, паднауся гвалт. Стралялi для страху. Каля Залатагорскаго касьцелу, кажуць, забiлi двух мужчын i адну кабету. Потым казалi, што гэта нiпраўда, брахня. Хто яго тут разьбярэ…

На горадзi ходзяць розныя цёмныя чуткi. Кажуць, што жыды збiраюцца зьнiшчыць усе цэрквi i касьцёлы, а потым прыйдзе антыхрыст. Адозвам мейсцовай бальшавiцкай улады нiхто нi дае веры. А трэба сказаць, што бальшавiкi паперы нi шкадуюць. Увесь горад аблеплен усялякiмi адозвамi, дэкрэтамi, прыказамi, пагрозамi i успакаеннямi. Кiдаецца у вочы вялiзная, як дзiцячае прасьцiрадло, афiша з напiсам: «Удержымъ-ли мы власть?» Гэта камандуючы заход. фронту, п. Мясьнiкоў, заклiкаў 25-го студня на лекцыю. Кажуць, што п. Мясьнiкоу зьняверыуся у бальшэвiцкай уладзi i правадзiў тую думку, што калi iх падтрымае эўрапейскi пролетарыят, то бальшэвiкi застануцца у уласьцi. «Мы уйдемъ, но скоро вернемся»,—закончыў сваю лекцыю п. Мясьнiкоу.

Сталiчных газэт у горад нi пускаюць. Газэтчыкi езьдзяць па сталiчныя газэты недзя пад Барысау, а потым прадаюць крыёма у горадзi па 1 рб. за нумар. У мейсцовых газэтах друкуюцца толькi такiя весткi, што нi шкодзяць i спрыяюць чыннасьцi бальшэвiкоу. За весткi iншаго характару газэты закрываюцца i награжаюць друкарням рэквiзiцыяй, калi выпусьцяць што-колькiк такое, што нi пад густ будзе бальшэвiкам. Так быу сконфiскован першы нумар «Вольнай Беларусi». Потым за весткi аб эвакуацыi Мiнску былi закрыты газэты: «Dziennik Miński», «Мiнская Газэта» i «Placówka». Цiпер яны выходзяць пад iнымi назвамi. I «Dziennik Miński» стау «Goniec Miński», а закрытая польская «Placówka» так i памерла.

26 студня хавалi 3 салдатау, забiтых у бою с палякамi. Труны былi аббiты чырвоным палатном. Каля Мiнску, на зьлiтай сьлязьмi i крывёю зямлi Беларускай, зноў гатуецца военная крываўнiца. Завялiся палякi з бальшэвiкамi, цi бальшэвiкi с палякамi,—с польскiмi легiонамi. Сьцягваюць войско. Гатуюцца к вайне. Нiма надзеi, што прыдуць да згоды. Вялiкая злосьць апанавала спорнiчакау. Былi стычкi пад Воршай, Унечай i Ушай. Есьць забiтыя i раненыя. Пад Унечай бальшэвiцкае войско разабрало рэйкi, i цягнiк с польскiм войскам быў пераразуляны. Бабруйская фортэцыя ужо цiпер занята польскiмi легiонамi. Чорныя хмары военнай калатнiны зноў павiсьлi над Беларусьсю. У перадзi зноў ахвяры, зноў горо, пакута i сьлёзы. Беларускаму народу зноў давядзецца перажыць той военны жах i страхоцьце, каторыя, здавалося, ужо перажыты. Ужо палякi выказалi жудасную думку, што у разi вайны, яны павядуць не па усiм правiлам военнчыны, Гэта значыць, што населенне мае перажыць новую вайну з усiм тым, да чаго яна прымушае. Толькi беларускае войско збавiло-б край ад новае напасцi, абвясьцiўшы яго нейтральным. Толькi яно магло-б сказаць сваё гаспадарскае слово i прыпынiць распачатую бойню. Але беларускаго войска нiма, яго забаронено укладаць i нiма каму заступiцца за наш абяздолены край. Беларусь нi мае гаспадара i нiма каму захiлiць ее ад новаго нiшчасьця.

Тым часам, нiшчыцца апошняя завязь беларускiх военных арганiзацый. 26 студня а дванастай гадзiнi у ночы у памешканьню Цэнтр. Вайсковай Беларускай Рады арыштованы намесьнiк старшынi Выканаўчаго камiтэту Рады, Езавiтоў i цiсар Захарка за што—нiма ведама. Арэшт рабiлi узброенныя матросы па ордэру Мiнскаго Сов. Р. i С. Дэпутатау. Пры арэшцi забралi усе паперы, накiнутыя рэчы разбурылi i, памiж iншым, захапiлi с сабою i двух прыватных людзей, трапiўшых у Раду на той час выпадкова.

Кажуць, што посьля роспуску Гарадзкой думы, новы бальшэвiцкi загадчык народнае прасьветы заявiў, што нiякiх беларускiх школьных патрэбнасьцей нi трэба. Гэта ужо фармальны паход на беларушчыну, якога нi было i пры самадзяржаўю. Трэба сказаць, што новы загадчык народнае прасьветы родам латыш, а па прозьвiску—Рэзаускi, той самы Рэзаускi, каторы разам с Крыленкiным разганялi штыкамi Усебеларускi зьезд. Рэзаускi кепска, з грубым латышскiм акцэнтам, говорыць па-расiйску. Еньжа наводзiў цэнзуру на першы нумар «Вольнай Беларусi» i шмат чаго выкасавау.

27-го студня варнулася у Мiнск беларуская дэлегацыя, што пасылалася у Брэст на мiрную конфэрэнцыю. Троцкi сказау, што ён беларускае дэлегацыi нi знае i загадау нiкога нi пускаць у Брэст без яго пасьведчэння. Такiм чынам долi Беларусi вырашаецца без беларусау.

Язэп Лiхадзеускi.

Пагарэльцы, Навагруд. павету. Давялося мне быць на фронцi, кiруючыся на Баранавiчы. Ад станцыi Пагарэльцы (апошняя станцыя перад Баранавiчамi) да няменкiх акопау 12 верст. На гэтым працягу страў толькi двух вартуючых салдатау, якiя нясуць варту на разбуранай чугунцы. Акром iх, узброеных салдатау нiдзе нi вiдаць. Калi i сустрачалiся, дык толькi тыя, што варочаюцца ад няменкiх акопау.

Беларусы, з занятых немцамi абшарау, асвабанiўшыся ад военшчыны, спяшаюцца на свае сялiбы, але немцы нiкога нi пускае. I таўкуцца гэтыя людзi каля станцыi Пагарэльцы, вымысьляючы, як-бы прабрацца да дому. Адзiн адному вучаць, прабуюць iсьцi iзноў, але у немца строгiя парадкi—i прыходзiцца беднякам марнець.

Антось Пракарына, селянiн з вёскi Пагарэльцы, што вёз мяне, паказвау пугаўём на адзiнокiя дрэуцы на полi, каторыя азначалi быўшыя там вёскi. Лесу нiдзе анi званьня. Увесь высечан на зямлянкi i акопы, як немцамi, так i нашымi. Вёскi папалены. На палавiнi дарогi ад Пагарэльцау да нямецкiх акопау астауся вялiкi сад. Пытаюся—чый ён— i чую адказ: «Гэта копiндак». Тут было мястэчко Крошына»,—«А дзе-ж стала самае мястэчко?»—«А вось тут!» i паказвае Пракарына на голае поле, дзе i пэглiны нi вiдаць. I успомнiуся мне смаляды беларускi поэт с Крошына…

га нават прозьвішча ні захавалося, каб ні асталося цяпер ані знання ад самога Крошына. Сумна стало на душы... Так, Маці Беларусь, гінуць твае сыны, ніштожацца вёскі, мястэчкі!

Дарагая Крывічына! Цяжкі лёс выпаў табе с прадвеку і да нашых дзён. Параскіданы цяпер твае дзеці, блудзяць па сьвеці і ні маюць прытулку. Калі утварыўся конгрэс тваіх сыноў-дэпутатаў у Міпску, ім ні далі магчымасьці заступіцца за цябе. І цяпер, калі ідзе торг у Брэсьці і спраўляецца трызна над часткаю тваіх абшараў, тваіх прадстаўнікоў адмоўляюцца пусьціць туды, бо мусіць сумленне ні пазваляе на вачох сыноў тваіх, пры сьведках, кроіць землю тваю на часткі. Мусіць Троцкаму і Радэку, што прыехалі у Брэст з жанкамі, як на баль, ні хочацца, каб беларускія прадстаўнікі крыкам болі псавалі яму настрой. Завязаўшы вусны беларусам на зьезьдзі у Мінску, петраградзкі урад баіцца, каб беларус ні загаманіў на увесь сьвет у Брэсьці.

А нямецкія салдаты сьмяюцца і пацешаюцца, што 4-х дзюймовую гармату разам с шасьцярыком каней пры поўнай запражцы, можна купіць у расійскіх салдатаў за 150 рублёў. А расійскія салдаты купляюць у іх заміж гарэлкі тую брыду, якою яны труцяць мышэй...

Пустое поле, поле цябошчыкаў. Усюды дрот калючы. Нідзе ні лясочка, толькі дзе-ні-дзе тырчаць пні. Відаць немяц на варці, каля яго другі. Той лічыць грошы, расійскія грошы за мышыную атруту. Здалёк чуваць пьяная песьня «Маруся отравилась»...

Сумна... А вось і Пагарэльцы. Повяц вакзал салдатаў... І адкуль яны узяліся? Лужуць семячкі...«Праўды». «Звязды»... Піск блудзячай маладзіцы... Сумна!

Сымон Рак.

Яраслаў. Кепска жывецца тут бежанцам-беларусам. Мясцовая арганізацыя беларусаў чуць ліпее. Адзін, два чалавекі цягнуць усю работу... Хадзілі чуткі, што арганізацыя саўсім распадаецца, але падасьпела падмога з боку салдатаўбеларусаў 211-го пешага полка. Праца зноў рухаецца і можна спадзявацца, што арганізацыя разрасьцецца. 21-го студзеня адбыўся першы агульны сход адноулевае арганізацыі разам з воінамі-беларусамі.

Сымон Старасьцюк.

Петраград. У першы раз на III зьездзі Радаў Раб. Салд. і Сел. дэпутатаў, паміж іншымі фракцыямі была згуртована грамадка беларусаў-соцыялістаў, якая заняла мейсцо на зьездзі між большавікамі і інтэрнацыяналістамі. Праўда, грамадка беларусаў была нівялікая у параўнаньні з другімі фракцыямі,—усяго с 15-і чалавек, але гоману нарабіла аб сабе многа. Расійская дэмакратыя бадай што ніколі аб беларускіх соцыялістах гэтульскі ні гаманіла. Другі інтэрэс,—у які бок хіліцца гэтая гаворка. Большавікі і левыя эс-эры крычалі, што беларусаў-соцыялістаў німа, што гэта самазванцы, трэслі на іх кулакамі і пагражалі пабіць, але нічога ні памагало. Не, не,—ды і загаворыць хто небудзь з грамадкі беларусаў. Яны скардзіліся і даводзілі пра хвальшывую палітыку большэвікоў у нацыянальным пытанні, напаміналі аб разгоні усебеларускага зьезду і—крык і пратэсты былі ім адказам. На беларусаў сыпаліся мянюшкі: каледаінцы, згоднікі з буржуазыяй і т. п. Ні досыць таго,—мабыць, беларусы-соцыялісты дужа разалі вочы камісарам «западной вобласьці» з Міхайловым на чале. І яны, гэтыя паны з дэмакратыі, павялі болей адважную барацьбу, хоць і ніпачэсную для дэмакратыі, за тое рашучую. Матэрыялам яны запасьліся раней, перад зьездам. Ні важны гэта быў матэрыял,—с хлусу і плётак зложаны, але падпёрты «рэальнаю сілаю». Едучы на зьезд, камісары захапілі с сабою тузін «бѣлоруссовъ» с Слуцкаго павету, каторыя катэгорычна запратэставалі супроць аддзелу Беларусі. Гэтаго, казалі яны, дамагаюцца толькі паны, а з імі падкупленыя беларусы-соцыялісты. Вось гэты тузін цёмных вырадкоў с Случчыны, да пяць-шэсьць «сьведомых» камісараў «Западной области», да два-тры чужынцы соцыялісты з Віцебшчыны,—на агульны лік чалавек з дваццаць,—зрабілі сход наперакор беларусам-соцыялістам і доўга спрачаліся аб тое, як ім называцца: ці проста соц.-дэмакратамі, ці соц.-дэмакратамі «так званай Беларусі». Нарэсьці, ухвалілі протэст, назваўшы яго «Протестъ соціалистовъ съ Бѣлоруссіи».

У гэтым протэсьці, прачытаным на зьездзі і потым выдрукованым у «Правдѣ», гаварылося, што Мінскі зьезд беларускі складаўся з адных памешчыкаў і згоднікоў-соцыялістаў, што усе цяперашнія беларускія вайсковыя і іншыя рады—гэта контр-рэвалюцыйныя гнезды, што яны іх пастанавілі разагнаць і шм. др.. Частка зьезду падарыла протэстантаў воплескамі. Беларусам-соцыялістам адказаць на тую хлусьбу ні дазволілі.

Нацыянальнае пытанне ляічэ дужа нізразумела для расійскай дэмакратыі. Ды і якое ім дзела да нацыянальнага пытання? Яны належаць да... расійскай інтэрнацыянальнасьці і—баста. І стоючы на гэтым грунці, яны лічаць усякі нацыянальны рух буржуазным. Каб ні даць мейсца беларусам у Цэнтр. Выкан. Камітэці, яны апратэставалі сем мандатаў, выданых прадстаўнікам рады без жаднае матывіроўкі.

— «Што-ж? — падумалі беларусы-соцыялісты:—іх сіла—іх воля».

Толькі трэба навучыцца трохі, каб ведаць самых сябе, каб ні сароміцца сябе потым, а з расійскай дэмакратыяй беларускім соцыялістам бадай што спаткацца яшчэ давядзецца.

Д. Жылуновіч.

Дэклярацыя

Беларускай міравой дэлегацыі.

Нас паслаў Выканаўчы Комітэт Рады 1-го Усебеларускага Зьезду селянскіх, салдацкіх і Работніцкіх дэпутатаў з дадаткам прадстаўнікоў мейсцовых гарадзкіх і земскіх самаўправаў і іншых дэмократычных і грамадзянскіх організацый. На гэтым зьездзі, які адбыўся 5—17 сьнежня 1917 году у г. Мінску-Беларускім, народ беларускі быў прадстаўлены 1167 дэлегатамі с пастанаўляючым голасам і 705 з дарадчым.

Зьезд даручыў сваей Радзі, а праз яе і Выканаўчаму Комітэту, паслаць на міровыя уклады у месьці Бярэсьце прадстаўнікоў Белай Русі дзеля абароны і пільнавання яго праваў пры надпісанні агульнага дэмократычнага міру на грунце ніраздзельнасьці Беларусі і ніадарванасьці яе ад Расійскае Дэмакратычнае Фэдэратыўнае Рэспублікі.

Выканаўчы Комітэт Рады 1-го Усебеларускага Зьезду, дапоўнены прадстаўнікамі рэволюцыйнае дэмократыі нацыянальных меншасьцяў Беларусі у асобі Краевага Комітэту партыі Соцыялістаў Рэволюцыянэраў, Злучанае Гэбрайскае Соцыялістычнае Работніцкае партыі (С. С. і Е. С.) і Гэбрайскае Соцыял-Дэмократычнае Работніцкае партыі «Поалэй Цыон» даў нам вось які

Н А К А З:

Выходзючы з грунтоўных прынцыпаў дэмократычнага міру і грунтуючыся на пастановах 1-го Усебеларускага Зьезду і на пастановах Рады таго-ж Зьезду, мы, прадстаўнікі Беларусі, першымі умовамі зьдзейсьнення сваіх надзеяў лічым:

1) Уся Беларусь у сваіх этнографічных рубяжох есьць ядынаю і ніраздзельнаю і уваходзіць, як аўтономная часьціна, на роўных правох у Расійскую Дэмократычную Фэдэратыўную Рэспубліку.

2) Нацыянальныя меншасьці маюць на Беларусі нацыянальна-персональную аўтономію.

3) Окупованыя акругі, заселяныя беларусамі, далучаюцца да аўтономнае Беларусі.

4) Окупованая частка Беларусі ачышчаіцца ад займаючага яе войска.

5) Усе бежанцы Беларусі вертаюцца на бацькоўшчыну на конты міжнароднаго фонду.

6) На конты таго-ж фонду павінны быць адбудованы пабураныя вайною вясковыя і местовыя гаспадаркі і вынлачуюцца усе страты наперпеўшаму ад вай-

ны народу, адпаведна рэальнае каштоунасьці сапсованага і зьніштожанага дабра.

7) Вольная падача галасоу усяго без выпятку народу окупаванае часткі Беларусі аб справе сваей дзяржаунай прыналежнасьці робіцца пасьля навароту на мейсцы беларусау.

Увага. Пункты 5, 6 пашыраюцца на увесь народ Беларусі, ні уважаючы на нацыянальнасьць і рэлігію.

Агульны дэмократычны мір павінен быць угрунтованы на гэтых прынцыпах:

1) Мір без анэксій і контрыбуцый на груньці самавызначэння народау.

2) Справа льосу окупованых цяпер зямель разьвязуіцца цераз вольную падачу галасоу самога народу, посьля навароту на мейсцо у окупаваныя акругі бежанцоу і посьля выводу аттуль усіх войскау, што там знаходзюцца, незалежна ад таго, да якой яны стараны належуць. Плебісцыт робіцца у два годы па падпісанню міру.

3) Адбудаванне пабураных вайною гаспадарак і зварот стратау пацярпеушаму ад вайны народу робіцца на кошты міжнароднаго фонду і незалежна ад таго, да якой нацыянальнасьці ці рэлігіі належыць пацярпеушы народ. Узятыя з народу окупованых краеу контрыбуцыі павінны быць зьвернуты. Выдаткі на утрыманне войска палонных ні водная старане ні вертаюцца.

4) Паступовае агульнае разброение і пераход да сыстэмы народнае міліцыі.

5) Патаемная дыпломатыя касуецца. Усе дагаворы набіраюць сілы толькі адно па зацьвярджэнню іх дэмократычнымі установамі народнаго прадстаунiцтва тых краеу і народау, каторыя учыняюць дагавор.

6) Устанауляіцца Ліга народау, якая рэгулюе узаемныя адносіны усіх народау сьвету. Уводзіцца абавязковы міжнародны арбітраж.

7) У ва усіх падпісуючых мір дзяржавах, касуюцца усе нацыянальныя і рэлігійныя адмежаванні. Устанауляіцца вольнасьць эміграцыі і колёнізацыі дзеля усіх народау; справы нацыянальных меншасьцяу забезпечуюцца нацыянальна-пэрсональнай аутаноміей.

Увага. Уновазо сьцьмонараньня праз міравую конфэрэнцыю новых дзяржавау павінно быць выключэнне замагрэбавання папярэдняго пункту.

8) Абвешчаіцца амністыя па усім дзяржауным праступкам, зьвязаным з вайною.

9) Эконамічны дагавор незалежны ад палітычнаго дагавору, павінен быць згодны з гэтакімі тэзысамі:

а) Хаурусы дзеля эконамічнае ізоляцыі аднаго альбо некольких дзяржавау — ні дапушчаюцца.

б) Мытны пратэкцыонізм касуецца і абвешчаіцца вольны гандаль.

в) У разі захавання мыта, падпісуючыя мір дзяржавы даюць адно аднаму правы найбольш спагаданай нацыі. З гэтаго правіла ні выключаюцца і тыя спагаданыя варункі, якія былі даны адно аднаму дзяржавамі што былі уперад у адным мытным хаурусі.

10) На агульным міравым конгрэсі маюць удзел і прэдстаунікі усіх нэйтральных краеу і нідзержауных народау.

11) Міравы дагавор набірае сілы толькі тады, калі яго зацьвердзюць дэмократычныя установы народнаго прадстаунiцтва тых краеу і народау, якія падпісуюць дагавор.

12) Народ, які лічыць сябе пакрыуджаным пры падпісанню міравое умовы, накідае за сабою права патрабаваць перагляду гэтае умовы пры падпісанні агульнаго міру.

Старшыня Выканаучаго Комітэту
Рады 1-го Усебеларускаго Зьезду
Язэп Варонка.

Пісар *Макар* Косьцевіч.

Место Мінск-Беларускі.
Студня 19-го 1918 г.

Да усіх народау Расіі і дэмократыі усяго сьвету.

Маючы на увазі дамаганне Гэрманіі на Беларускую зямлю і заявы, зробляныя прадстаунікамі аустро-гэрманскай міравой дэлегацыі у Брэсьці, што народы, наседяючыя забраную праціунікам тэрыторыю, выказалі жаданне а д ы й с ь ц і ад Расіі да Гэрманіі,—Беларуская Народная Грамада у Маскве, выказываючы волю двух зьездау беларусау-уцекачоу 24-27 верэсьня і 19-21 кастрычніка 1917 году, на якіх былі прадстаунікі болей як ад 1.500,000 населення Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губ. акупованых цяпер ворагам, і згодна с пастановамі 1-го Усебеларускаго Зьезду у Мінску,—гэтым паведамляе усім народам Расійскай Фэдэратыунай Дэмократычнай Рэспублікі і дэмократыі усіх краеу сьвету, як хаурусным Расіі, так і праціунікам, вось аб чым:

1. Заява кіраунікоу аустро-гэрманскай дэлегацыі аб тым, што народы, наседяючыя забраныя ае войскам тэрыторыі, хочуць перайсьці пад апеку Вільгэльма ні у якім выпадку ні можа адносіцца да населення беларускіх зямель, т. е., Гродзеншчыны, часьці Віленшчыны і Міншчыны. Населенне гэтах земляу, амаль усё беларускае, яшчэ у восень 1915 г., ратуючыся ад ворага, пакінуло родную землю і пайшло у Расію*). На мейсцох асталася толькі часьць паноу і гандляроу ні беларусау, жаданне якіх ні можа быць голасам селянства беларускаго народу.

2. Ні адзін беларус з забраных праціунікам беларускіх земляу ні мае на думцы добравольна быць падданым Гэрманіі, або Аустрыі. Двухмільённая масса уцекачоу, разам с усім 10-ці мільёным беларускім народам разумеіць свае дзяржаунае істнаванне толькі у складзі Расейскай Фэдэратыунай Дэмократычнай Рэспублікі.

3. Е д ы н ы б е л а р у с к і н а р о д н і м о ж а б ы ц ь р а з р э з а н ы н а ч а с ь ц і п р ы у т в а р э н н ю м і р а. Народы Расіі і дэмократыі усіх краеу, як хаурусных ей, так і праціуных, ні павінны дапусьціць, каб да цяжкіх мук селянскаго беларускаго народу, якія ён цярпеу у мінулым і якія церпіць у гэтую страшную вайну, дабавілася новая пакута, як ніволя у чужой дзяржаве.

4. Пры усіх комбінацыях міравой палітыкі варажлуючых старон, беларускаму народу у цэлым павінно быць дано сьвятое права вызначаць сваю долю і выкаваць сабе тую форму дзяржаунаго істнавання, якая адына адпаведае яго гісторыі і да яго чыста селянскаго дэмократычнаго быту. Магчымасьць гэта павінна быць дасягнута ім цяпер, да установы граніц сумежных з Беларусью народау і дзяржавау.

5. Бараніць свае дабыткі, сваю зямлю і сваю долю прыдушэны вайною беларускі народ ні можа. Абарона гэтая ёсьць доуг усей Расіі і дэмократыі усяго сьвету. Да іх зьвертаюць свой кліч уцекачы-беларусы і вераць, што яны дасягнуць гэтае мэты. Змучаныя горам, яны спадзяюцца, што ім прыдзецца вярнуцца ні у чужую дзяржаву, ні пад ярмо заваявацялеу, але на сваю родную вольную Беларускую землю.

Беларуская Народная Грамада у Маскве.

Уселякія весткі.

Новы календар.

Выдан дэкрэт аб тым, што с 1-го лютаго (феураля) 1918 г. календар старога стылю зьмяняецца на новы. На моцы гэтаго, першы дзень посьля 31-го студня трэба лічыць ні першым лютым, а чатырнадцатым лютым, другі дзень лютаго лічыць пятнаццатым і т. далей.

З ліку тых дэкрэтау, якімі большэвіцкі урад хоча ашчасьлівіць населенне вольнай рэспублікі расійскай, гэты дэкрэт можна уважаць найменш шкадлівым і сьмела можна сказаць, што ён ні выкліча апазыцыі з боку людзей, ні большэвіцкіх паглядау. Німа ведама толькі, як зразумеюць гэтую рэформу масы дэмократычныя і ці ні паглядаюць яны на гэта, як на замах на іх традыцыі і веру. Гэта тым больш магчыма, што вось

---

*) Беларусы пакідалі свой родны край ні самі, а па прымусу расійскаго войска і земскіх ...

ла зьмены календара і праз царкоўную уладу абвесьціла, што ні будзе лічыцца з гэтым дэкрэтам.

Справа зьмены календара ні раз ужо разглядалася у дзяржаўных інстытуцыях старой Расіі, але пастаянна разьбівалася аб консэрватызм сфэр клерыкальных з аднаго боку і аб комбінацыі палітычныя з другога.

Як ведама, новы стыль у рахоўлі часу уведзен быў папою Грыгорам XIII у 1582 годзі. Як глава р.-каталіцкай цэркві, ён ні уважаўся за аўтарытэт у краёх протэстанскіх, а тым больш у краёх усходніх, дзе пануе вера грэцкаго звычаю. У той час грыгорыянскі [стары календар завецца юліянскім, —ад Юлія Цэзара, імпэратора рымскаго] календар прызналі толькі у краёх каталіцкіх, як у Італіі, Гішпаніі, Португаліі і Польшчы. Праз два месяцы, 4 сьнежня 1582 году, яго прынялі у Францыі, а на другі год—у каталіцкай часьці Нямеччыны, Швайцарыі і Голяндзіі; у Вэнгрыі у 1587 годзі.

Рух рэлігійны, каторы у той час паўстаў у большай часьці Нямеччыны і выклікаў заўзятую барацьбу протэстантызму с касьцёлам каталіцкім, стаў на перашкодзе уводзіню тады календара грыгорыянскаго. Толькі у 1699 г. протэстанская частка Нямеччыны прыняла новы стыль, як «папраўлены», а так само Данія, рэшта Швайцарыі і Голяндзіі. Памалу календар грыгорыянскі уведзен быў на усіх цывілізованых гасударствах. Апошняю прыняла яго Швэцыя у 1753 годзі. Асталася адно сярод эўропэйскіх гасударстваў толькі адна Расія і малэнькія дзяржавы праваслаўнаго звычаю на Балканах.

Цяпер і Расія, на мочы дэкрэту большэвіцкаго ураду, прылучылася у рахоўлі часу да дзяржаваў эўропэйскіх. Пара ёй і у іншых сфэрах жыцьця прыбліжыцца хоць трохі да Эўропы.

Цікава выясьніць, як сталася тая розьніца, што існуе цяпер паміж новым і старым стылем. Стары, або юліянскі календар, апрацованы александрыйскім астраномам Созігенам і быў установлен Юліям Цэзарам [illegible] г. да Р. Х.; хрысьціянская царква яго прыняла на Нікейскім [illegible] годзі.

У глыбокай старасьвеччыні [illegible] да [illegible] часу у [illegible] і габраяў (жыдоў) год выраховываецца па руху месяца уакруг зямлі і лічыцца роўным 12-ці месяцам, с каторых кожны мае у сабе [illegible] $29\frac{1}{2}$ дзён, або столькі часу, колькі трэба яго для павароту месяца да [illegible] і [illegible]. Созіген [illegible] за год час роўнаго павароту зямлі уакруг сонца (тропічны год), памылкова залічыўшы яго за $365\frac{1}{4}$ дзён. Сапраўды-ж, тропічны год ровен 365 днём, 5 гадз., 48 мін., 48 сэкун., т.-е. меншы за $365\frac{1}{4}$ дзён: стала быць, год Созігена адстае ад тропічнаго году на 11 мін. і 12 сэкундаў.

К часу папы Грыгорыя XIII розьніца у часі новаго і старога стылю раўнялася 10 днём, і гэта памылка была папраўлена такім спосабам: розьніца на 3 дні, каторая складаецца на працягу кожных 400 год, выпраўляецца так, што тры першыя с чатырох па парадку гадоў у сталецці лічацца ні вісакоснымі, а простымі. Такім чынам, 1700, 1800, 1900 годы па грыгорыянскаму календару простыя, а толькі 2000 год—вісакосны. Гэта рахоўля так само ні саусім поўная, але розьніца на 1 дзень набіраецца толькі праз 4240 год.

Усходняя праваслаўная царкаў ні прыняла «папскаго календара», і дзякуючы гэтаму, зрабілася розьніца у старым, юліянскім, календару на 13 дзён і утварылося многа ніявыгод.

Напрыклад, у тых, хто трымаецца старога календару, Каляды сьвяткуюцца 25-го сьнежня, а у тых, хто жыве па новаму календару, яны сьвяткуюцца у больш справядлівы тэрмін—на 13 дзён раней.

Беларускі тэатр.

«Міхалка», «Як яны жаніліся», «У зімовы вечар.»

28 і 29 студня г. г. у залі клюбу служачых Л.-Р. ж. д. адбываліся беларускія спэктаклі.

28-го ставілі пераклады з украінскаго «Міхалка» і «Як яны жаніліся», 29-го образок Оржэшко «У зімовы вечар» і дывэртысмэнт.

Дзеля нядахвату мейсца, нельга напісаць зьместу стаўленых рэчаў, а так сама падробна прасьледзіць ігру артыстаў. Трэба адзначыць, што добра іграў у «Як яны жаніліся» Я. Беларус, старанна і умела правела сваю роль В. Тарасік і Ш. Андрэеў. У абразку «У зімовы вечар», як заўсёды добра іграў Крыміт (роль бацькі), В. Тарасік (роль цёткі Насты), глыбока зразумеў сваю роль і усёй душою іграў Ш. Андрэеў (падарожны).

[illegible] ролі выпоўнены вельмі добра. Таго нельга сказаць пра другарадныя ролі. Роль «Крыстыны», вельмі маленькая, выпоўнена была так, што горш і нельга. Чыя тут віна: рэжысэра ці артыстаў—ні ведома, але хутчэй рэжысэра, што пусьціў на сцэну людзей, каторым казі і абходзе тэатр, то, мабыць, толькі так сабе...

Такім [illegible]-артыстам ні мейсцо у тэатры наогул, а у беларускім—тым больш.

Вельмі старанны быў падбор дэклямацыі і сьпеваў.

Артыстычна выпоўніў «Я. Беларус» дэклямацыю «Важная фіга» Ядвігіна Ш., Р. Жакоўскі вершы Марцінкевіча і др.

Відаць вялікае стараньне і праца большай часткі артыстаў, а гэта—галоўнае, і гэту працу, на карысьць роднаго тэатру, прыходзіцца шчыра вітаць.

В. Ю.

М-ко Койданово, Мінск. губ. 22-го студня г.г. у нашым мястэчку адбыўся беларускі спэктакль. Ставілі «Паўлінку» Я. Купалы і першую дзею «Антося Лапы» Т. Гушчы. Ігралі мейсцовыя артысты-аматоры і прыехаўшыя з Мінску артысты беларускаго тэатру. Ігра наогул была вельмі добрая. Пасьля спэктаклю была дэклямацыя.

Беларускі спэктакль публіка сустрэла вельмі прыхільна. Памешчэньне, у якім адбываўся спэктакль, перароблянае з валаснаго гумна, было літаральна напоўнено. Вялікае уражэньне зрабіла дэклямацыя беларускіх вершаў.

Доўгія воплескі і гарачыя выклікі были шчырай падзякай артыстам.

Койданаускі.

Літэратура і навука.

1) «Бѣлоруссь и Литва». Экономическій очеркъ А. П. Власова, бывшаго рэдактара «Нашае Нівы», напісаны па расійску. У 1917 г. гэты нарыс друкаваўся у «Вольнай Беларусі» па-беларуску.

Брашура выдана Выкан. Коміт. Цэнтр. [illegible] Беларускае Рады. Каштуе 40 к.

2) «Бѣлорусская Рада»—газэта [illegible], орган Цэнтр. [illegible] Беларускае Рады. 15-го студня выйшаў № 1.

Зьмест № 1: «Самоопредѣленіе Бѣлоруссіи»—І. Воронко; «1-го Января 1918 г.»—[illegible]; «Бѣлорусскій день», [illegible]; «О 1-мъ Всебѣлорусскомъ Съѣздѣ»—Е. В-ча, резолюціи, [illegible] и т. д. Цана № 25 коп.

3) «Бѣлорусская Рада» № 2, № 2 ні вышоў.

Зьмест № 2: «Границы Бѣлоруссіи»—Е. В-ча; «Да здравствуетъ Бѣлоруссія!»—[illegible]; «Обязательства»—[illegible]; «[illegible]»; Резолюція, протэсты, [illegible].

Рэдактар Я. Лёсік.